ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі "Жукоўшчынская базавая школа"
________________________В.А. Палуносік
08.09.2023

ПАЛАЖЭННЕ
аб Бацькоўскім універсітэце дзяржаўнай установы адукацыі "Навучальна-педагагічны комплекс Жукоўшчынскі дзіцячы сад – базавая школа"

Сапраўднае Палажэнне распрацавана ў адпаведнасці з нарматыўнымі прававымі дакументамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па арганізацыі ўзаемадзеяння ўстановы адукацыі з сям'ёй.

**1.Агульныя палажэнні**

1.1. Бацькоўскі ўніверсітэт з'яўляецца адной з форм работы з бацькамі (законнымі прадстаўнікамі) навучэнцаў. Гэта адукацыйны праект, накіраваны на фарміраванне ў бацькоў (законных прадстаўнікоў) навучэнцаў кампетэнцый, якія дазваляюць эфектыўна рашаць пытанні выхавання, развіцця і адукацыі дзяцей.

1.2. Бацькоўскі ўніверсітэт ствараецца і функцыяную пры дзяржаўнай установе адукацыі "Навучальна-педагагічны комплекс Жукоўшчынскі дзіцячы сад – базавая школа".

1.3. Дзейнасць Бацькоўскага ўніверсітэта будуецца ў адпаведнасці з дадзеным Палажэннем.

1.4. У дзейнасці Бацькоўскага ўніверсітэта на дабравольной аснове прымаюць удзел бацькі (заклнныя прадстаўнікі) навучэнцаў установы адукацыі, педагагічныя работнікі і іншыя зацікаўленыя арганізацыі і структуры.

**2. Мэта і задачы Бацькоўскага ўніверсітэта**

2.1. Мэтай Бацькоўскага ўніверсітэта з’яўляецца павышэнне псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці бацькоў (законных прадстаўнікоў) у вобласці выхавання і развіцця дзяцей.

2.2. Для дасягнення і рэалізацыі мэты мяркуецца рашэнне наступных задач:

фарміраванне ў бацькоў (законных прадстаўнікоў) ведаў аб узроставых асаблівасцях і патрэбах дзяцей і падлеткаў;

пашырэнне ведаў бацькоў (законных прадстаўнікоў) аб псіхалогіі сямейных адносін;

павышэнне псіхолага-педагагічнай культуры бацькоў (законных прадстаўнікоў), навучанне іх сучасным псіхолага-педагагічным ведам аб псіхічным, фізічным, інтэлектуальным развіцці дзіцяці на розных узроставых этапах яго жыцця;

фарміраванне ў бацькоў (законных прадстаўнікоў) усвядомленага стаўлення да бацькоўства;

авалоданне эфектыўнымі тэхналогіямі і метадамі выхавання дзяцей у сям'і;

развіццё здольнасці да рэфлексіўных паводзін у працэсе зносін з дзецьмі;

актуалізацыя навыкаў эфектыўнай камунікацыі для гарманізацыі дзіцяча-бацькоўскіх адносін;

развіццё ўзаемаразумення, супрацоўніцтва сям'і і ўстановы адукацыі.

**3. Арганізацыйная структура Бацькоўскага ўніверсітэта**

3.1. Бацькоўскі універсітэт складаецца з сістэмы лекторыяў, тэматыка пасяджэнняў якіх прысвечана цэнтральным праблемам выхавання з улікам заканамернасцяў развіцця дзіцяці ў розныя ўзроставыя перыяды:

для бацькоў навучэнцаў I- IV класаў - «Маё дзіця – малодшы школьнік»;

для бацькоў навучэнцаў V-IX класаў - «Маё дзіця - падлетак».

3.2. Змест работы бацькоўскага ўніверсітэта фарміруецца на падставе запытаў бацькоў і актуальных праблем сямейнага выхавання, на дыферэнцыраванай аснове.

3.3. У рамках бацькоўскага ўніверсітэта могуць выкарыстоўвацца наступныя формы працы:

прамыя:

лекцыі, гутаркі, круглыя сталы, тэарэтычныя семінары, семінары-практыкумы, трэнінгавыя заняткі, дзелавыя гульні, ролевыя гульні, бацькоўскія канферэнцыі, індывідуальныя гутаркі і кансультацыі;

дыстанцыйныя:

вебінары, an-line-кансультацыі, an-line- апытванні па рознай тэматыцы, стварэнне буклетаў, лістовак і інш.

**4. Арганізацыя работы Бацькоўскага ўніверсітэта**

4.1. Бацькоўскі універсітэт будуе сваю работу на прынцыпах дэмакратыі, галоснасці, павагі і ўліку меркаванняў і інтарэсаў бацькоў.

4.2. Перыядычнасць пасяджэнняў Бацькоўскага ўніверсітэта не радзей чатырох разоў у навучальны год (адзін раз у 2 месяцы).

4.3. Агульнае кіраўніцтва і каардынацыю за дзейнасцю Бацькоўскага ўніверсітэта ажыццяўляе намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце ўстановы адукацыі.

4.4. Намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце ўстановы адукацыі:

4.4.1. ажыццяўляе кантроль за вынікамі работы Бацькоўскага ўніверсітэта.

4.5. За рэалізацыю бацькоўскага ўніверсітэта ў кожным класе адказвае класны кіраўнік.

4.6. Бацькоўскі ўніверсітэт можа рэалізоўвацца ў вочнай і ў дыстанцыйнай форме, у выпадку пагаршэння эпідэміялагічнай сітуацыі толькі ў дыстанцыйнай форме.

4.7. Пасяджэння Бацькоўскага універсітэта пратакольна афармляюцца класнымі кіраўнікамі.

**5. Чакаемыя вынікі**

5.1. Актывізацыя бацькоў (законных прадстаўнікоў) як удзельнікаў адукацыйных адносін, развіццё сацыяльна-педагагічнага партнёрства сям'і і ўстановы адукацыі;

5.2. Павышэнне ўзроўню педагагічнай кампетэнтнасці бацькоў (законных прадстаўнікоў), стварэнне спрыяльных умоў для выхавання і развіцця дзяцей у сям'і.

5.3. Фарміраванне новага тыпу аднаго з бацькоў (законнага прадстаўніка) – сацыяльна адказнага чалавека, які актыўна ўдзельнічае ў выхаванні дзіцяці.